ры. Проведенный анализ оркестровых партитур дает возможность констатировать, что оркестровая фактура является важным средством для раскрытия образно-эмоционального содержания и художественной идеи музыкального произведения. Она выступает как уровень, на котором проявляются не только особенности индивидуального композиторского письма, но и характерные черты оркестрового стиля белорусской музыки для оркестров народных инструментов конца XX – начала XXI в.

## НОРМЫ ВЫКАРЫСТАННЯ ГІТАРЫ Ў ЛІТУРГІЧНЫМ І ПАЗАЛІТУРГІЧНЫМ АБРАДЗЕ РЫМСКА-КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ

***Г. І. Гарадзецкая,***
*аспірант кафедры сусветнай мастацкай культуры*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Музыка заўсёды была звязана з хрысціянскімі абрадамі. Гімны, псалмы, вершы, якія ўваходзяць у склад Бібліі, становяцца носьбітам аб’яўлення Хрыста. У Апостальскай сталіцы Рымска-каталіцкай царквы спеў з’яўляецца дарам Святога Духа, так як пропаведзь керыгмату.

Керыгмат (з грэц. kήρυγμα – аб’ява, абвяшчэнне) у хрысціянстве абазначае абвяшчэнне Слова Божага вернікам; у біблейска-тэалагічным значэнні паняцце вызначае ўрачыстае выратаванне Богам і заклік да пакаяння і хрышчэння [2].

Каталіцкая царква заўжды клапацілася аб захаванні розных форм сакральнага мастацтва. Гэта можна заўважыць у павелічэнні каштоўнасці духоўнай музыкі. Літургія па сваёй прыродзе не толькі дазваляе музыку, але і патрабуе яе. Музыка ў літургіі не з’яўляецца суправаджэннем, а інтэгруецца ў здзяйсненні Святых абрадаў. Такіх абрадаў (сакрамантаў) у

каталіцкай царкве не шмат, але да кожнага належыць адпаведнае музычнае суправаджэнне. Аб нормах выкарыстання таго ці іншага музычнага інструмента сведчыць Канстытуцыя аб Літургіі Другога Ватыканскага сабора «Sacrosanctum Concilium» ад 5 верасня 1967 г. і інструкцыя «Musicam sacram» ад 5 сакавіка 1967 г. У сакрамантах Хросту, Бежмавання, Сужэнства, штодзённай Эўхарыстыі ў якасці музычнага суправаджэння звычайна выкарыстоўваецца арган і харавы спеў. Акрамя парадку выкарыстання музычных інструментаў, Кодэксу і Інструкцыі падпарадкоўваецца музычны рэпертуар [1, с. 33].

Выбар твораў падчас літургіі залежыць ад тэкстаў Слова Божага. Але не ў кожнай парафіі касцёла існуе арганіст, тым больш арган. Суправаджаць спеў падчас літургіі сталі на гітарах. Такая тэндэнцыя была вельмі папулярна ў 1990-х гг. у невялікіх каталіцкіх парафіях Беларусі. На гітарах ігралі на імшы для дзяцей і моладзі. Такая практыка выкарыстання дадзенага інструмента вельмі прываблівала і захапляла сучаснае пакаленне, а між іншым стала распаўсюджвацца ў гарадах. Амаль што кожная літургія з удзелам дзяцей і моладзі суправаджалася спевам пад гітару. Дадзеныя спевы, таксама як і суправаджаемыя арганам спевы, складаліся на тэксты з Бібліі, але насілі свецкі і займальны характар. Як правіла, музыка павінна суправаджаць малітву чалавека падчас літургіі, а не дамінаваць над ёй ці нават перашкаджаць. Менавіта прастата такой музыкі спрыяе зацікаўленасці моладзі, але за гэтай прастатой губляецца сапраўдны сэнс духоўнасці і праўдзення абрада літургіі.

Дадзенай з’явай сур’ёзна зацікавіліся каталіцкія біскупы Беларусі, Польшчы і Украіны. Каб вырашыць чарговыя пытанні, якія тычацца літургічнай музыкі і выкарыстання адпаведных інструментаў падчас літургіі, 13–14 кастрычніка 2017 г. у польскім горадзе Любліне было сабрана 377-е пленарнае пасяджэнне Канферэнцыі Епіскапата Польшчы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Епіскапамі было прынята рашэнне з'мяніць рэгламент ігры на музычных інструментах у каталіцкіх святынях. Належыць выконваць літургічную музыку, якая мае высокую мастацкую якасць выканання і накіравана на святасць культу святыні, клопат аб высакароднай прыгажосці сакральнай музыкі, годнасці літургічных абрадаў і пабожнасці верных. У каталіцкай царкве нельга выконваць творы свецкага характару. Менавіта такімі лічацца творы, выконваемыя на гітары [3, с. 1].

Каб цалкам не забараняць выкарыстанне гітары ў касцёле, было вырашана змяніць умовы і месца выканання для дадзенага інструмента. Паколькі літургія не адпавядае гэтаму, ігру на гітары дазволілі ў пазалітургічным абрадзе. Гэта могуць быць канцэрты праслаўлення, канцэрты літургічнай музыкі па-за межамі касцёла, парафіяльныя моладзевыя супольнасці. Падчас такіх канцэртаў выконваецца музыка, створаная на тэксты Святога Пісання, але ў свецкім характары. Гэта музыка, як і літургічная, скіравана на праслаўленне Хрыста, толькі з дапамогай сучасных музычных інструментаў і своеасаблівым спосабам. Падобная музыка пішацца ў розных музычных стылях, такіх як поп, хрысціянскі рок, рэп, метал, джаз, госпел і г. д. Прыкладам праяўлення такіх стыляў з'яўляюцца польскія супольнасці Arka Noego, Luxtorpeda, Pokój i Dobro, Rymcerze, New Life'M і інш. На тэрыторыі Польшчы праца і творчасць дадзеных гуртоў ужо не з'яўляецца чымсьці экстраардынарным. Музычная практыка польскіх гуртоў складае больш за 30 год. Гурты не працуюць пры канкрэтнай каталіцкай парафіі, а арганізоўваюць свае канцэрты на розных гарадскіх пляцоўках Польшчы і за яе межамі. Самымі вядомымі з'яўляюцца штогадовыя канцэрты праслаўлення ў рамках фестывалю Strefa Chwały (Новы Сонч, Польша) і рокавы канцэрт у рамках агульнапольскага евангелізацыйнага праекта Przystanek Jezus (Костшын над Одрай, Польшча), якія арганізуюцца на адкрытых пляцоўках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Канцэрт праслаўлення – новая форма малітвы пры дапамозе музыкі. Своеасаблівая духоўная музыка, у якой аб'ядналіся класічныя традыцыі і папулярныя сучасныя моладзевыя стылі, такія як госпел, дыска, хіп-хоп, тэхна і інш.

Падобныя фестывалі скіраваны на духоўнае паяднанне веруючых людзей і тых, хто толькі пачынае даведвацца аб веры. Музычнымі сродкамі ўдзельнікі фестываляў евангелізуюць прысутнасць Хрыста сярод нас. Падчас такіх фестываляў прымаюць удзел ад 700 да 1200 евангелізатараў з Польшчы, Германіі, Англіі, Ірландыі, Чэхіі, Украіны, Беларусі і інш. Фестываль збірае евангелізатараў з розных царкоўных асяроддзяў, даючы вопыт адзінства ў евангелізацыйнай місіі. Гэта вельмі асаблівая з'ява, так як на такіх фестывалях тэорыя і прагненне еднасці становяцца фактычным знакам Евангелізацыі.

Евангелізацыя з'яўляецца адкрытай формай навучання і прапаведання Божага Слова. У такіх агульнапольскіх фестывалях прымае ўдзел не толькі моладзь з Польшчы, але і з замежных краін – Германіі, Аўстрыі, Чэхіі, Расіі, Украіны і інш. Сярод гэтых краін прымае ўдзел і моладзь з Беларусі. Дзякуючы адчыненасці такіх фестываляў, моладзь можа прыязджаць і пераймаць вопыт у арганізацыі і правядзенні такіх мерапрыемстваў. Плёнам такіх паездак стала паступовая зацікаўленасць моладзі праяўленнем сваёй веры і практыкай яе праз падобнага тыпу музыку. У межах каталіцкіх парафій Беларусі пастулова сталі арганізоўвацца моладзевыя музычныя гурты, якія, афіцыйна не парушаючы нормы інструкцыі «Musicam sacram», ствараюць пазалітургічную музыку ў розных сучасных стылях. Да такіх гуртоў адносяцца евангелізацыйны праект «Рыбы», гурты Ave, Veni, Laudans, United in Spirit, «Подых Духа», «Небасхіл» і інш. У дадзеных гуртах удзельнічае не толькі моладзь, але і духоўныя асобы (айцы, ксяндзы).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўнымі пляцоўкамі для выканання свайго рэпертуару з'яўляюцца парафіі каталіцкай царквы, духоўныя фэсты, сустрэчы моладзі, адарацыі. У Беларусі падобныя мерапрыемствы арганізоўваюцца падчас фэсту абраза Маці Божай Будслаўскай (а/г Будслаў, Мядзельскі р-н), Агульнабеларускіх Дней моладзі (г. Гродна), Малітоўнай сустрэчы моладзі (м. Івянец, Валожынскі р-н, Мінская вобл.), Музычнай майстэрні (м. Івянец, Валожынскі р-н, Мінская вобл.). Падчас фэсту ў Будславе арганізоўваецца начны евангелізацыйны канцэрт у гарадку, дзе да ўдзелу запрашаюцца розныя беларускія каталіцкія гурты. Яны выконваюць уласныя творы на тэксты са Святога Пісання ў суправаджэнні гітар, ударнай установкі і іншых музычных інструментаў, якія не дазваляюцца літургічным канонам. Падобныя канцэрты праслаўлення адбываюцца не толькі падчас вышэй пералічаных мерапрыемстваў, але і ў выпадковы, вольны час. Гурты прыязджаюць у каталіцкія парафіі Беларусі і арганізоўваюць для парафіян канцэрты, якія з'яўляюцца своеасаблівым сродкам Евангелізацыі.

Такім чынам, можна адзначыць, што жанры літургічнай музыкі займаюць першаснае месца, яны захоўваюцца традыцыямі і нормамі каталіцкай царквы. Выкананне паліфанічнай музыкі на аргане, спеў Грэгарыянскага харала і харавое выкананне падчас літургіі застаецца непарушным для літургічнага абраду. Трэба адзначыць, што сучасныя сродкі Евангелізацыі, якія разумеюць выкананне апрацаванай музыкі на гітары, не былі забаронены Апостальскай сталіцай. Для гэтага былі створаны ўсе ўмовы і падпісан дазвол у інструкцыі «Musicam sacram» аб развіцці пазалітургічнай музыкальнай традыцыі. Дадзеная інструкцыя дазваляе арганізацыю пазалітургічных парафіяльных канцэртаў, канцэртаў праслаўлення, евангелізацыйных канцэртаў у стылі поп, хрысціянскі рок, хіп-хоп, госпел, джаз, суправаджаемых гітарамі, барабанамі, саксафонам і іншымі інструментамі. Вельмі цяжка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўявіць сабе выкананне сучаснай музыкі падчас літургічнага абраду, таму каталіцкай царквой было дазволена прымяненне такой музыкі ў пазалітургічным абрадзе, не парушаючы традыцый і нормаў літургіі.


*1.* Кангрэгацыя абрадаў: Інструкцыя «Musicam sacram» ад 5 сакавіка 1967 г. // арт. 14: AAS 59, p. 305. – 1967. – 104 с.

*2.* Literatura i sztuka: kerygmat [Zasób elektroniczny] // Encyklopedia PWN. – Tryb dostępu: https://encyklopedia.pwn.pl/encyklopedia/kerygmat. – Data dostępu: 10.03.2019.

*3.* Zebrania Plenarne Konferencji Episkopatu Polski od 14 października 2017 r. Komunikat z 377. – Lublin : Wydawnictwo KUL, 2017. – 2 s.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВІРТУАЛЬНЫЯ ПРАЕКТЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ (да Года малой радзімы)


***І. У. Градоўкіна,***

*загадчык аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*


Сучасныя тэхналогіі дазваляюць ствараць якасна новыя рэсурсы, якія комплексна спалучаюць самыя розныя віды інфармацыі. Карыстальнікам прадастаўляецца адзіная кропка доступу як да аўтэнтычных крыніц, так і да разнастайных матэрыялаў, іх аналітыка-сінтэтычнай і навуковай апрацоўкі, значна палягчаецца пошук і аналіз неабходнай інфармацыі.

За апошнія гады ў межах дзейнасці па бібліяграфічным і віртуальным узнаўленні беларускай гісторыка-культурнай спадчыны Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ) ажыццявіла шэраг цікавых і, думаецца, запатрабаваных навукова-даследчых і выдавецкіх праектаў, якія набылі асаблівую актуальнасць у сувязі з абвяшчэннем Года малой радзімы. Тэмы і ідэі для такіх праектаў часта даюць менавіта тыя матэрыялы, якія назапашваюцца ў ходзе пастаяннай мэтанакіраванай работы па фарміраванню бібліяграфічных, паў-